# РАЗДЗЕЛ I

# СУЧАСНАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ КАРТА СВЕТУ І ПАЛІТЫЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ





# ТЭМА 1 ДЫНАМІКА ПАЛІТЫЧНАЙ КАРТЫ СВЕТУ

## § 2. Аб'екты палітычнай карты свету

***Успомніце.*** Што такое палітычная карта свету? У чым заключаецца дынамічнасць палітычнай карты свету? Якія этапы фарміравання прайшла сучасная палітычная карта свету? Якія дзяржавы маюць самую вялікую плошчу?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Чаму сучаснаму чалавеку неабходна ведаць асаблівасці фарміравання палітычнай карты свету? Выкажыце здагадку, для якіх спецыяльнасцей у будучыні гэтыя веды стануць найбольш актуальнымі. У якіх установах адукацыі і на якіх спецыяльнасцях можна атрымаць прафесію, звязаную з глыбокім веданнем працэсаў, якія адбываюцца на палітычнай карце свету?

**Аб'екты палітычнай карты свету.** Палітычная карта свету дынамічная праз змены, якія адбываюцца з межамі, плошчай дзяржаў і тэрыторый: яны аб'ядноўваюцца, распадаюцца, з'яўляюцца суверэнныя дзяржавы, змяняюцца формы кіравання або ладу і інш. Таму асноўнымі *аб'ектамі*, якія ўзаемадзейнічаюць і ўплываюць на развіццё палітычнай карты свету, з'яўляюцца *дзяржавы* і *тэрыторыі* (мал. 8).

Сярод дзяржаў выдзяляюць *незалежныя (суверэнныя) і самаабвешчаныя*.

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Адзіным міжнародным дакументам, у якім пералічваюцца прыкметы дзяржаўнасці з пазіцыі міжнароднага права, з'яўляецца *Канвенцыя Мантэвідэа*, падпісаная ў 1933 г. У ёй замацаваныя чатыры асноўныя прыкметы дзяржавы: пастаяннае насельніцтва, пэўная тэрыторыя, уласны ўрад, здольнасць да ўступлення ў зносіны з іншымі дзяржавамі.

$П_1$

Дзяржаўная тэрыторыя (ДТ) выступае натуральным асяроддзем пражывання насельніцтва і функцыянавання дзяржавы і ўключае шэраг элементаў (мал. 8-1).

Дзяржаўная тэрыторыя характарызуецца плошчай, асаблівасцямі геаграфічнага становішча, пэўнымі прыроднымі ландшафтамі, узроўнем гаспадарчай засвоенасці




Мал. 8. Аб’екты палітычнай карты свету




Мал. 8-1. Элементы дзяржаўнай тэрыторыі

і г. д. У мінулым памеры тэрыторыі дзяржавы і яе павелічэнне ўспрымаліся як сімвал магутнасці і доказ геапалітычнай моцы.

**Суверэнныя дзяржавы і залежныя тэрыторыі.** На палітычнай карце свету XXI ст. пераважаюць *суверэнныя дзяржавы*. Іх колькасць расце. У 1900 г. у свеце было 55 суверэнных дзяржаў, у 1945 г. — 51, а ў 1947 г. — 81. Да 2000 г. суверэнітэтам валодалі ўжо больш за 190 краін. Па даных за 2023 г., 193 суверэнныя дзяржавы і 2 назіральнікі асаблівага статусу (Ватыкан і Палесціна) з’яўляюцца членамі ААН.



**Свет і Беларусь.** Вызначце, да якой гістарычнай падзеі адносяцца паэтычныя радкі Янкі Купалы:

Ты з Заходняй, я з Усходняй
Нашай Беларусі,
Больш з табою ўжо ніколі
Я не разлучуся…

Якое дзяржаўнае свята ў Рэспубліцы Беларусь адзначаецца ў гонар гэтай падзеі?

*Залежныя тэрыторыі (калоніі)* — гэта краіны і тэрыторыі з пэўнымі межамі, якія знаходзяцца пад той ці іншай формай апекі з боку суверэннай дзяржавы і не валодаюць поўнай палітычнай самастойнасцю (паводле Статута ААН). Такая тэрыторыя не валодае палітычнай незалежнасцю, але можа карыстацца аўтаноміяй. Колькасць залежных тэрыторый скарачаецца. У цяперашні час у свеце налічваецца больш за 30 залежных тэрыторый, 17 з іх афіцыйна ўключаны ў спіс ААН.

Напрыклад, у Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне гэта Новая Каледонія і Французская Палінезія (належаць Францыі); Гуам (ЗША); Піткэрн (Вялікабрытанія). Самая вялікая па колькасці насельніцтва залежная тэрыторыя — Пуэрта-Рыка, а самая вялікая па плошчы тэрыторыя з асаблівым статусам — Грэнландыя.

Знайдзіце на карце залежныя тэрыторыі. Якая з залежных тэрыторый знаходзіцца бліжэй за ўсё да Рэспублікі Беларусь?

$П_2$

Сярод тэрыторый, якія не маюць самастойнага кіравання, вылучаюцца тэрыторыі асаблівага эканамічнага статусу — афшорныя зоны. Афшорную зону адрозніваюць наступныя прыкметы: падатковыя льготы (нізкія падатковыя стаўкі); ананімнасць ажыццяўлення бізнесу; адсутнасць валютнага кантролю; магчымасць вядзення аперацый у любой валюце і інш.

Па класіфікацыі міжнароднай Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР), краіны, дзе рэгіструюць афшорныя кампаніі, падзяляюць на дзве групы (мал. 8-2).




Мал. 8-2. Групы афшорных краін

У краінах першай групы дзяржава не прад'яўляе ніякіх патрабаванняў да справаздачнасці, акрамя ўнясення штогадовага фіксаванага збору ў бюджэт. Звычайна ў такіх краінах не вядзецца рэестр акцыянераў і дырэктараў, канфідэнцыяльнасць валодання такой кампаніяй вельмі высокая.

У краінах другой групы пры захаванні падатковых ільгот патрабуюць фінансавую справаздачнасць. З боку ўрада гэтых дзяржаў кантроль больш жорсткі, чым у краінах першай групы. У гэтых краінах вядзецца рэестр дырэктараў і акцыянераў, але і прэстыж кампаній значна вышэйшы.

Для невялікіх астраўных тэрыторый гэтая дзейнасць з’яўляецца сур’ёзнай крыніцай даходу.

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Тэрмін «афшор» упершыню з’явіўся ў адной з газет ЗША ў канцы 1950-х гг. Гаворка ішла пра фінансавую арганізацыю, якая пазбегла ўрадавага кантролю шляхам геаграфічнай выбіральнасці. Іншымі словамі, кампанія перамясціла дзейнасць, якую ўрад ЗША хацеў кантраляваць і рэгуляваць, на тэрыторыю са спрыяльным падатковым кліматам. Такім чынам, тэрмін «афшор» уключае ў сябе не толькі юрыдычнае паняцце, але і эканоміка-геаграфічнае.

**Самаабвешчаныя дзяржавы.** Па прычыне канфліктаў, звязаных з імкненнем аддзяліцца і атрымаць суверэнітэт, узнікаюць *самаабвешчаныя дзяржавы*. Яны валодаюць усімі прыкметамі дзяржаўнасці (насельніцтва, тэрыторыя, урад, суверэнітэт), але ў той жа час не маюць поўнага міжнароднага прызнання або прызнаныя часткова. Сярод самаабвешчаных дзяржаў выдзяляюць *непрызнаныя* і *часткова прызнаныя дзяржавы*.

*Непрызнанымі лічацца дзяржавы, якія не прызнала ніводная дзяржава — член ААН*. Гэта, напрыклад, Прыднястроўская Малдаўская Рэспубліка. *Дзяржавы, якія не маюць магчымасці ўступіць у ААН, але прызнаюцца ў якасці дзяржаў некаторымі дзяржавамі — членамі ААН, атрымалі назву часткова прызнаных*. Да іх адносяцца, напрыклад, Турэцкая Рэспубліка Паўночнага Кіпра, Рэспубліка Косава, Рэспубліка Абхазія і Рэспубліка Паўднёвая Асеція, Дзяржава Палесціна.

**Роля сталіц ў кіраванні дзяржаўнай тэрыторыяй, віды сталіц.** Сталіца — гэта афіцыйна галоўны горад краіны, у якім размешчаныя асноўныя дзяржаўныя органы ўлады, якія маюць агульнанацыянальнае значэнне: рэзідэнцыі кіраўніка дзяржавы і ўрада, нацыянальныя міністэрствы і ведамствы, вышэйшыя судовыя органы, галоўны заканадаўчы орган (парламент) і яго асобныя палаты.

П₃

Акрамя таго, сталіца часта з’яўляецца найбуйнейшым горадам краіны па колькасці жыхароў, найважнейшым эканамічным, культурным, навуковым цэнтрам і г. д.

Палітычныя функцыі сталіц вызначаюць эфектыўнасць кіравання і кантролю над усёй дзяржаўнай тэрыторыяй.

Вылучаюць тры групы сталіц:

1) *сталіца пастаянная*, якую называюць таксама гістарычнай сталіцай. Яна выконвае функцыі галоўнага адміністрацыйнага, гаспадарчага і культурнага цэнтра краіны на працягу некалькіх стагоддзяў, размешчаная ў гістарычным ядры дзяржавы. Гэта, напрыклад, Парыж, Рым, Афіны і інш.;

2) *сталіца прызначаная*, якая вызначаная на аснове прынятых рашэнняў заканадаўчай улады ў новы час. Такі тып характэрны, напрыклад, для Аўстраліі, дзе за ролю сталіцы канкурыравалі Мельбурн і Сідней, але вырашана было пабудаваць новую сталіцу — Канберу, у баку ад канкуруючых цэнтраў. Па Канстытуцыі Бразіліі, прынятай у 1891 г., сталіцай павінен быць горад, які знаходзіцца ў геаграфічным цэнтры краіны. Менавіта сюды, у горад Бразілія, і была перанесеная сталіца з Рыа-дэ-Жанэйра. За званне сталічнага горада Канады вялася барацьба на працягу многіх гадоў. З Таронта ў Квебек і назад сталіца пераязджала 4 разы, пакуль у 1857 г. каралева Вікторыя сваім рашэннем не прызначыла сталіцай Атаву;

3) *сталіца падзеленая* існуе ў дзяржавах, дзе функцыі кіравання не сканцэнтраваныя ў адным цэнтры, а падзеленыя паміж некалькімі гарадамі. Напрыклад, у Нідэрландах парламент размяшчаецца ў Гаазе, а каралеўская рэзідэнцыя — у афіцыйнай сталіцы (Амстэрдаме); у Балівіі прэзідэнт, урад і парламент знаходзяцца ў Ла-Пасе, а Вярхоўны суд — у Сукрэ; рэзідэнцыя прэзідэнта Чэхіі знаходзіцца ў Празе, а Вярхоўны суд размяшчаецца ў горадзе Брно.

П4

**Міжнародныя тэрыторыі.** Адным з важных аб'ектаў палітычнай карты свету з'яўляюцца міжнародныя тэрыторыі. Яны знаходзяцца па-за дзяржаўнымі межамі і маюць асаблівы статус. Права іх выкарыстання належыць міжнароднай супольнасці. Як правіла, міжнародныя тэрыторыі служаць пляцоўкай для навуковых даследаванняў.

*Антарктыка* — самы вялікі ў свеце некрануты прыродны запаведнік плошчай амаль 14 млн км$^2$. Прававое становішча Антарктыкі як міжнароднай тэрыторыі вызначае Дагавор аб Антарктыцы. Ён быў падпісаны ў 1959 г. у Вашынгтоне 12 дзяржавамі, якія вялі ў Антарктыцы навуковыя даследаванні (Аргенціна, Аўстралія, Бельгія, Чылі, Францыя, Японія, Новая Зеландыя, Нарвегія, Паўднёва-Афрыканскі Саюз, СССР, Вялікабрытанія і ЗША). У дагаворы адзначаецца, што выкарыстанне Антарктыкі магчыма толькі ў мірных мэтах, і вызначаецца свабода навуковых даследаванняў. У цяперашні час яго ўдзельнікамі з'яўляюцца 48 дзяржаў. Кожныя 1–2 гады ў сталіцах краін — удзельніц Дагавора праходзяць кансультатыўныя нарады. У ліку кансультатыўных бакоў — ЗША, Вялікабрытанія, Францыя, Кітай і Расія. Штаб-кватэра пастаяннага Сакратарыята знаходзіцца ў Буэнас-Айрэсе (Аргенціна).

*Адкрытае мора* ўключае марскую паверхню, якая не адносіцца да дзяржаўнай тэрыторыі. Яна выкарыстоўваецца для свабоднага пералёту, суднаходства, рыбалоўства, пракладкі падводных кабеляў і трубаправодаў, для навуковых даследаванняў усімі дзяржавамі з уваходам і без выхаду да мора.

*Дно мораў і акіянаў за межамі нацыянальнай юрысдыкцыі* — гэта таксама міжнародная тэрыторыя, таму яно не можа быць прысвоенае якой-небудзь дзяржавай.

*Касмічная прастора* як міжнародная тэрыторыя выкарыстоўваецца выключна ў мірных мэтах для даследаванняў і не можа быць прысвоеная дзяржавамі.

Да міжнародных тэрыторый адносяцца таксама *міжнародныя рэкі*, *пралівы*, *каналы*. Яны забяспечваюць выхад кантынентальных дзяржаў да мораў. Суднаходства ў іх свабоднае. Напрыклад, міжнароднымі рэкамі прызнаныя Рэйн, Вісла, Дунай, Нігер, Конга і шэраг іншых. Прыкладамі міжнародных пралівах з'яўляюцца Баб-эль-Мандэбскі, Гібралтарскі, Дрэйка, Карэйскі, Ла-Манш, Магеланаў, Па-дэ-Кале, Сінгапурскі, Басфор і Дарданэлы.

**Прасторавыя формы дзяржаў.** Дзяржаўная тэрыторыя ўнутры дзяржаўных меж ахоплівае: 1) частку паверхні сушы; 2) унутраныя і тэрытарыяльныя воды; 3) паветраную прастору, якая распасціраецца над сушай і водамі. Важным параметрам дзяржаўнай тэрыторыі з'яўляецца канфігурацыя і форма тэрыторыі краіны.

На аснове канфігурацыі дзяржаўнай тэрыторыі выдзяляюць некалькі прасторавых форм дзяржаў:

1) *дзяржавы выцягнутай або няправільнай формы* (напрыклад, Чылі, Нарвегія, В'етнам, Італія, Гамбія). Тэрыторыя гэтых краін працягнулася ўздоўж марскога ўзбярэжжа або далін буйных рэк на многія сотні кіламетраў (мал. 9);




Мал. 9. Выцягнутая форма дзяржаўнай тэрыторыі Італіі

> ***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Размешчаная ў цэнтры краіны сталіца Чылі Сант'яга мае слабыя эканамічныя сувязі з пустыннымі раёнамі паўночных меж з Перу і Балівіяй, а таксама палярнымі марскімі раёнамі Вогненнай Зямлі. Вялікая працягласць Італіі з поўначы на поўдзень з'яўляецца адной з прычын эканамічных адрозненняў паміж рознымі рэгіёнамі краіны.

2) *дзяржавы з кампактнай тэрыторыяй*, якія маюць форму, блізкую да квадрата або круга (напрыклад, Францыя, Іспанія, Польшча, Венгрыя і інш.) (мал. 10). Пры такой форме назіраецца роўная аддаленасць усіх памежных раёнаў ад цэнтра краіны;




Мал. 10. Кампактная форма дзяржаўнай тэрыторыі Іспаніі

> ***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Аднак пры адносна спрыяльнай знешняй форме на тэрыторыі краіны могуць знаходзіцца буйныя прыродныя бар'еры і цяжкадасягальныя раёны. Гэтыя натуральныя перашкоды будуць ускладняць функцыянаванне дзяржавы. Напрыклад, Перу падзеленае на дзве часткі высокімі хрыбтамі Анд, а пустынныя раёны Егіпта слаба заселеныя і часткова ізаляваныя ад галоўнай паласы рассялення па даліне і дэльце Ніла.




Мал. 11. Фрагментарная форма дзяржаўнай тэрыторыі Філіпін

3) *фрагментаваныя дзяржавы*, якія складаюцца з некалькіх частак, падзеленых тэрыторыяй іншых краін або міжнароднымі водамі (напрыклад, дзяржавы-архіпелагі — Інданезія і Філіпіны (мал. 11), «падвоеная» Малайзія, размешчаная на паўвостраве Малака і востраве Калімантан);

4) *дзяржавы, якія маюць у сваім складзе анклавы/эксклавы* — невялікія раёны, адрэзаныя ад асноўнай тэрыторыі дзяржавы землямі іншых краін або размешчаныя ўнутры тэрыторыі іншых дзяржаў (напрыклад, Калінінградская вобласць Расіі) (мал. 12).

П$_5$

Калі глыбей зацікавіцца палітычнай картай свету і паразважаць, чаму тыя ці іншыя дзяржавы маюць розны палітычны ўплыў у свеце, можна заўважыць наступны падзел на групы: *трансканттынентальныя* (напрыклад, Расія), *субкантынентальныя* (напрыклад, Кітай, Бразілія, Індыя), *макрарэгіянальныя* (напрыклад, Іран, Мексіка, Алжыр, Судан, Саудаўская Аравія), *мезарэгіянальныя* (напрыклад, Францыя, Егіпет, ПАР, Венесуэла). Асаблівую групу ўтвараюць краіны-экстрэмумы — так званыя *міні-дзяржавы* (напрыклад, Ліхтэнштэйн, Манака, Сан-Марына, Ватыкан), міжнародны прэстыж і суверэнітэт якіх павінны паважаць усе дзяржавы.

Анклавы/эксклавы часта адыгрываюць ролю стратэгічных фарпостаў (Калінінградская вобласць — заходні фарпост Расіі), важных эканамічных баз (Кабінда — галоўны вытворца ангольскай нафты). Аднак яны становяцца слабым месцам з ваеннага пункту гледжання: сувязі могуць быць перапыненыя або ўскладненыя суседнімі дзяржавамі.




Мал. 12. Анклаўнае размяшчэнне Калінінградскай вобласці Расіі

**Падвядзём вынікі.** Аб’ектамі палітычнай карты свету з’яўляюцца … . Напалітычнай карце свету налічваецца … суверэнных дзяржаў і … залежных тэрыторый. Колькасць залежных тэрыторый пастаянна скарачаецца.

На аснове канфігурацыі тэрыторыі вылучаюць наступныя прасторавыя формы дзяржаў: …, …, …, … .

***Праверым свае веды.*** 1. Назавіце асноўныя аб’екты палітычнай карты свету. 2. Назавіце асноўныя прасторавыя формы дзяржаў. 3. Якія тэндэнцыі характэрныя для сучаснай палітычнай карты свету?

***Ад простага да складанага.*** Паразважайце, якія перавагі маюць дзяржавы розных прасторавых форм (кампактнай, фрагментаванай і выцягнутай). У чым перавагі кампактнай формы тэрыторыі дзяржавы перад выцягнутай або фрагментаванай формай?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Складзіце вусны часопіс «Змяненні на палітычнай карце свету ў XX — пачатку XXI ст.».

# § 3. Міжнародныя канфлікты на палітычнай карце свету

***Успомніце.*** Чаму ўзнікаюць канфлікты паміж людзьмі? Прывядзіце прыклады канфліктаў, якія адбываюцца на планеце. Якая арганізацыя адыгрывае важную ролю ў вырашэнні рэгіянальных і лакальных канфліктаў?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Чаму канфлікты, якія ўзнікаюць, выклікаюць трывогу? Выкажыце здагадку, чаму з’явіўся новы напрамак у геаграфіі — геаканфлікталогія. Сферай дзейнасці якіх спецыялістаў з’яўляецца вырашэнне рэгіянальных і лакальных канфліктаў? Чаму прыказка «Лепш благі мір, чым добрая сварка» сёння актуальная?

**Прычыны, класіфікацыя і наступствы канфліктаў у свеце.** У сучасным свеце ўзнікаюць розныя канфлікты паміж дзяржавамі і рэгіёнамі.

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** У аснове канфліктаў ляжаць *тры групы фактараў*: *лакальныя, рэгіянальныя* і *глабальныя*. *Лакальныя* дзейнічаюць на канкрэтнай тэрыторыі і ў пэўнай краіне. Яны могуць быць звязаныя, напрыклад, з асаблівасцямі нацыянальнага складу і гісторыка-культурнага развіцця. *Рэгіянальныя* фактары дзейнічаюць у пэўным рэгіёне ў выніку сутыкнення інтарэсаў палітычных, эканамічных аб’яднанняў дзяржаў. *Глабальныя* фактары ўключаюць буйныя палітычныя працэсы ў развіцці сусветнай супольнасці. Напрыклад, крушэнне каланіяльнай сістэмы, сацыялістычнай сістэмы гаспадарання, глабалізацыя.

**Міжнародны *канфлікт*** — гэта рознагалоссе, супярэчнасць, спрэчка або вайна паміж дзвюма ці болей дзяржавамі, якія часта патрабуюць удзелу або кантролю з боку іншых членаў сусветнай супольнасці.

*Асноўнымі прычынамі* росту колькасці канфліктаў у свеце з'яўляюцца барацьба за рэсурсы, беднасць і нераўнамернае размеркаванне даходаў, нацыянальна-этнічныя, міжканфесіянальныя, тэрытарыяльныя супярэчнасці, але часцей за ўсё — іх спалучэнне.

Разнастайнасць прычын, маштабаў, форм праяўлення і іншых прыкмет сучасных канфліктаў тлумачыць неабходнасць іх класіфікацыі. У абагульненай форме віды канфліктаў прадстаўлены на малюнку 13.

**Па сферах праяўлення**
- міждзяржаўныя/міжнародныя
- унутрыдзяржаўныя/унутраныя

**Па прычыне**
- геаграфічныя/тэрытарыяльныя
- палітычныя
- эканамічныя
- ваенныя
- рэлігійныя
- культурныя і інш.

**Па маштабе ўздзеяння**
- глабальныя
- рэгіянальныя
- лакальныя

**Па працягласці ўздзеяння**
- доўгатэрміновыя
- сітуацыйныя

**Па формах праяўлення**
- мірныя
- нямірныя

Мал. 13. Класіфікацыя канфліктаў у свеце

Канфлікты ў краінах і рэгіёнах свету прыводзяць да негатыўных наступстваў. Сярод іх вылучаюць верагодныя бліжэйшыя і аддаленыя наступствы.

*Найбольш верагоднымі бліжэйшымі наступствамі* ваенных канфліктаў з'яўляюцца: гібель, траўмы, хваробы; забруджванне навакольнага асяроддзя; псіхалагічныя траўмы і інфармацыйнае ўздзеянне; разбурэнне эканомікі і сістэм жыццезабеспячэння насельніцтва. *Аддаленымі наступствамі* канфліктаў з'яўляюцца экалагічныя, эканамічныя, медыцынскія, сацыяльныя і дэмаграфічныя.

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Экалагічныя наступствы праяўляюцца ў выглядзе забруджвання навакольнага асяроддзя, знішчэння відавой біялагічнай разнастайнасці, крызісу ў сельскай гаспадарцы і інш. Эканамічнымі наступствамі з'яўляюцца перш за ўсё беднасць і голад. Сацыяльныя наступствы — нацыянальная варожасць, дэфармацыі культуры сям'і і інш. Дэмаграфічныя наступствы заключаюцца ў рэзкім зніжэнні долі мужчынскага насельніцтва і наступных хвалях спаду нараджальнасці.

Для кожнага рэгіёна свету характэрныя канфлікты. Частка іх адбываецца ў мірнай, няўзброенай форме, частка — у форме ўзброенага канфлікту. Аднак, у адпаведнасці

са Статутам ААН, адзіным правамерным спосабам вырашэння канфліктаў і супярэчнасцей паміж дзяржавамі з'яўляюцца мірныя сродкі: перамовы, прымірэнне, пагадненні або інш.

**Свет і Беларусь.** «Мы — мірныя людзі, не жадаем вайны. Мы не багатыя, але і ніколі не просім. Мы самі сваё шчасце заробім. Лепш дзясяткі і сотні гадоў перамоў, чым адзін дзень вайны» (Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка). Як гэтыя словы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адлюстроўваюць знешнюю палітыку нашай дзяржавы?

**Узброеныя канфлікты.** У XXI ст. перад светам стаяць пагрозы міжнароднай бяспекі: 1) распаўсюджванне зброі масавага паражэння; 2) міжнародны тэрарызм, этнічныя і рэлігійныя праблемы; 3) гандаль людзьмі, гвалт і інш. Некаторыя канфлікты не могуць быць вырашаныя мірным шляхам і адбываюцца з ваенным умяшаннем. У гэтым выпадку размова ідзе пра *ўзброеныя канфлікты*. Яны прадстаўляюць адну з форм вырашэння супярэчнасцей — з прымяненнем сродкаў узброенай барацьбы.

Узброены канфлікт мае *міжнародны* (з удзелам дзвюх і болей дзяржаў) або *ўнутраны* (у межах тэрыторыі адной краіны) *характар*. Асноўнымі прычынамі ўзброеных канфліктаў выступаюць: барацьба за рэсурсы і палітычнае навязванне іншага дзяржаўнага ладу, а таксама рэлігійныя разлады, расавая і этнічная нецярпімасць і інш.

Сярод узброеных канфліктаў унутраныя пераважаюць над міжнароднымі (міждзяржаўнымі) (мал. 14).




Мал. 14. Размеркаванне ўзброеных канфліктаў, 2022 г., %

**Геаграфія міжнародных канфліктаў.** XXI ст. характарызуецца палітычнай і сацыяльна-эканамічнай нестабільнасцю ў многіх рэгіёнах і краінах. З 2020 г. у свеце назіраецца павелічэнне колькасці канфліктаў. Гэта тлумачыцца ростам палітычнай канкурэнцыі, рэгіянальнымі крызісамі і развязваннем канфліктаў унутры краін.

У 2023 г. у свеце было зафіксавана 57 міжнародных канфліктаў у 35 краінах. Гэта самая вялікая колькасць канфліктаў з моманту заканчэння Другой сусветнай вайны (мал. 15). 30 % канфліктаў адбываюцца на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы, 30 % — у Афрыцы на поўдзень ад Сахары, астатнія — у Азіі.

Афрыка з'яўляецца рэгіёнам з найбольшай колькасцю канфліктаў — 28. Далей ідуць Азія і краіны Блізкага Усходу — 27, Еўропа — 1 і Амерыка — 1 (мал. 16).




Мал. 15. Дынаміка ўзброеных канфліктаў у свеце па рэгіёнах

| Рэгіён | Краіна | |
|---|---|---|
| Азія | Афганістан (2)<br>Індыя (2)<br>Інданезія<br>Іран (2)<br>Ірак<br>Ізраіль — Палесціна<br>Ізраіль — Паўднёвы Ліван | Емен<br>М’янма (6)<br>Пакістан (3)<br>Сірыя (3)<br>Тайланд<br>Турцыя<br>Філіпіны (2) |
| Афрыка | Бенін<br>Буркіна-Фасо (2)<br>Бурундзі<br>Камерун (3)<br>ДР Конга (2)<br>Кенія<br>Малі (2)<br>Мазамбік<br>Руанда | Нігер (2)<br>Нігерыя (3)<br>Самалі<br>Судан<br>Тога<br>Чад<br>ЦАР (2)<br>Эфіопія (2) |
| Еўропа | Расія — Украіна | |
| Амерыка | Калумбія | |

Мал. 16. Геаграфія міжнародных канфліктаў, 2023 г. (у дужках паказаная колькасць канфліктаў)

***Паразважаем.*** У многіх раёнах рэгіянальных канфліктаў, дзе ваенныя дзеянні спыніліся, склалася становішча хутчэй перамір'я, чым трывалага міру. З вострай стадыі яны перайшлі ў стадыю напружаных, або патэнцыяльных, канфліктаў. Чым небяспечная такая стадыя? Адказ патлумачце.

У 2023 г. было чатыры канфлікты, якія адносіліся да катэгорыі буйных (колькасць загінулых — больш за 10 тыс. чал. у год): грамадзянскія войны ў М'янме, Судане, канфлікт паміж Ізраілем і Палесцінай, канфлікт паміж Расіяй і Украінай.

*Афрыка* ў апошнія дзесяцігоддзі стала самым канфліктанебяспечным рэгіёнам свету. На працягу апошніх гадоў найбольш напружанае становішча было характэрнае для Судана, Буркіна-Фасо, Самалі. Большасць канфліктаў адбываецца па этнічных і рэлігійных прычынах, і яны вырашаюцца ўзброеным шляхам.

*Азія* ў XXI ст. характарызуецца шматлікімі ўзброенымі канфліктамі па палітычных, эканамічных і рэлігійных прычынах. Асноўнымі краінамі, дзе яны адбываюцца, з'яўляюцца краіны Персідскага заліва, Блізкага Усходу і інш.

**Свет і Беларусь.** У выступленні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі было адзначана, што ахова мяжы — гэта комплексная задача. Як вы разумееце значэнне і комплексны характар аховы дзяржаўнай мяжы нашай краіны ва ўмовах сучасных выклікаў?

На канфлікты ў *Амерыцы* найбольшы ўплыў раней аказвалі этнаканфесійны і сацыяльна-эканамічны фактары. У цяперашні час захоўваецца палітычны канфлікт у Калумбіі. У цэлым у параўнанні з іншымі рэгіёнамі канфлікты ў Амерыцы ўрэгулявання.

*Еўропа* выступае адносна стабільным рэгіёнам свету з нешматлікімі няўзброенымі і ўзброенымі канфліктамі (напрыклад, Прыднястроўе, Расія — Украіна, Каталонія, Краіна Баскаў). У аснове гэтых канфліктаў ляжаць эканамічныя, культурна-сацыяльныя і іншыя прычыны.

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Для параўнання краін па напружанасці сітуацыі распрацаваны Міжнародны індэкс канфлікту. Ён разлічваецца на аснове колькасці загінулых, небяспечнасці для грамадзянскага насельніцтва, геаграфічнай распаўсюджанасці і колькасці ўзброеных груповак. У залежнасці ад значэнняў індэкса краіны свету падзяляюцца на чатыры групы: з нізкім, няўстойлівым, высокім і экстрэмальным узроўнямі канфліктаў. У 2024 г. у 10 краінах свету назіраліся канфлікты экстрэмальнага ўзроўню, з найбольшымі значэннямі індэкса ў Палесціне, М'янме і Сірыі (мал. 17).

| Узровень канфлікту | Прыклады краін |
|---|---|
| Экстрэмальны | Палесціна, М'янма, Сірыя |
| Высокі | Ірак, Эфіопія, Венесуэла |
| Няўстойлівы | Іран, Лівія, Перу |
| Нізкі | Кітай, Танзанія, Чылі |

Мал. 17. Галоўныя міжнародныя канфлікты ў свеце (па індэксе канфлікту), ліпень 2024 г.

**Геаканфліктaлогія.** Праблема канфліктаў у свеце прыцягнула ўвагу вучоных розных навуковых дысцыплін. Узаемасувязь паміж канфліктам, яго характарам і геаграфічнай зонай фарміруе новы напрамак сацыяльна-эканамічнай геаграфіі — геаканфліктaлогію.

***Геаканфліктaлогія*** — гэта навука, якая вывучае ў адзінстве геаграфічныя, палітычныя і іншыя фактары, якія ўплываюць на ўзнікненне, развіццё і зыход палітычных, у тым ліку ўзброеных канфліктаў.

Найбольш актыўна гэты навуковы напрамак развіваецца ў краінах Еўропы.

**Падвядзём вынікі.** На палітычнай карце свету вылучаюць … і … канфлікты. Існуе шэраг прычын узнікнення канфліктаў: …, …, … .

Геаканфліктaлогія — новы напрамак у геаграфіі.

***Праверым свае веды.*** 1. Якія асноўныя прычыны і віды канфліктаў у свеце? 2. Што такое міжнародны канфлікт? 3. Прывядзіце прыклады канфліктаў у Афрыцы і Азіі. 4. Якія асноўныя прычыны ўзброеных канфліктаў? Якая іх геаграфія?

***Ад простага да складанага.*** 1. Пра якія ўзброеныя канфлікты вы чулі з інфармацыйных крыніц на працягу апошняга месяца? 2. Якія наступствы маюць узброеныя канфлікты для краін — суседзяў дзяржаў, што ўдзельнічаюць у канфлікце?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Праект «Сетка Школ міру ў Рэспубліцы Беларусь» — адна з інавацыйных форм пазакласнай працы. Падрыхтуйце прэзентацыю «Школы міру ў Беларусі — праваднікі міратворчасці».